**Этап 1. Фарміраванне тэрытарыяльных і акруговых выбарчых камісій**

У адпаведнасці з арт. 34 Выбарчага кодэкса Рэспублікі Беларусь ***тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі*** па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў утвараюцца прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі ў складзе 9–13 членаў камісіі. Названыя камісіі ўтвараюцца не пазней чым за 85 дзён да выбараў.

У адпаведнасці з каляндарным планам арганізацыйных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў Рэспублікі Беларусь дваццаць шостага склікання, зацверджанага Пастановай ЦВК ад 21.01.2010 № 7 вылучэнне прадстаўнікоў у склад тэрытарыяльных выбарчых камісій павінна адбыцца да 26 студзеня 2010 г. ўключна, а ўтварэнне тэрытарыяльных камісій – да 29 студзеня 2010 г.

***Акруговыя выбарчыя камісіі*** па выбарах дэпутатаў абласных Саветаў, тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, якія ажыццяўляюць у раёнах горада Мінска паўнамоцтвы акруговых выбарчых камісій па выбарах у Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў утвараюцца прэзідыумамі абласных, Мінскага гарадскога Саветаў дэпутатаў і абласнымі, Мінскім гарадскім выканаўчымі камітэтамі ў складзе 9–13 членаў камісіі не пазней чым за 75 дзён да выбараў.

Згодна з календарным планам вылучэнне прадстаўнікоў у склад акруговых выбарчых камісій павінна было скончыцца 5 лютага 2010 г., а ўтварэнне камісій – да 8 лютага 2010 г.

Названыя мерапрыемствы завяршыліся ў дакладнай адпаведнасці з каляндарным планам.

Выбарчы кодэкс дапоўнены нормай аб тым, што органы, якія ўтвараюць камісію, як правіла, не менш адной траціны яе складу фарміруюць з прадстаўнікоў палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў. Аналіз фарміравання выбарчых камісій паказвае, што гэтая норма рэалізавана ў поўнай меры. Так, у склад тэрытарыяльных выбарчых камісіяў у цэлым па Беларусі ўключаны 4171 прадстаўнікоў палітычных партый, іншых грамадскіх аб'яднанняў, што склала па ўсёй краіне 34,7% ад агульнага складу камісій.

Варта адзначыць, што ў складзе камісій працягвае заставацца нязначнай доля палітычных партый. У тэрытарыяльных камісіях доля партый склала толькі 0,9%, а ў акруговых - 6,6% ад агульнай колькасці членаў камісій. Пры гэтым доля апазіцыйных партый наогул мінімальная: 0,12% і 1,4% адпаведна. Акрамя таго, важна падкрэсліць, што больш за ўсё неўключэнняў ў камісіі прыйшлося менавіта на прадстаўнікоў палітычных партый. З 149 прадстаўнікоў, вылучаных палітычнымі партыямі ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, уключана ў цэлым па краіне 105 чалавек ці 70,5% ад колькасці вылучаных. Для параўнання працэнт ўключэння ў тэрытарыяльныя камісіі прадстаўнікоў грамадзян шляхам падачы заяў склаў 87,7%, працоўных калектываў – 95,5%, грамадскіх аб'яднанняў – 98% ад

колькасці вылучаных. Што тычыцца апазіцыйных палітычных партый, то тут працэнт ўключэння яшчэ ніжэй – 25%.

Больш за ўсё ў склад камісій уключана прадстаўнікоў Беларускай партыі левых «Справядлівы свет»: 9 прадстаўнікоў гэтай партыі ўключаны ў тэрытарыяльныя камісіі, 48 – у акруговыя, далей ідуць Аб'яднаная грамадзянская партыя (4 і 14 адпаведна), БСДП (Грамада) – 2 і 3, Партыя БНФ – 0 і 6.

Што тычыцца прадстаўнікоў аргкамітэта па стварэнні партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя», то яны вылучаліся шляхам збору подпісаў грамадзян. З 43 прадстаўнікоў БХД, вылучаных ў тэрытарыяльныя камісіі грамадзянамі, у склад камісій уключаны толькі 3, што складае каля 7% ад колькасці вылучаных. У той жа час агульны працэнт уключэнняў прадстаўнікоў шляхам збору подпісаў складае 87,7%. Гэта можа сведчыць аб тым, што ў камісіі ўключаюцца загадзя пэўныя асобы. (Гл. табл. 1).

Крыху змянілася сітуацыя пасля фарміравання акруговых выбарчых камісій. Доля палітычных партый і іншых грамадскіх аб'яднанняў у акруговых камісіях па краіне ўзрасла да 50%. Адначасова да 1,4% павялічылася і прадстаўніцтва апазіцыйных партый. З 180 прадстаўнікоў апазіцыйных партый у акруговыя камісіі ўключаны 72 (40% ад колькасці вылучаных). Нягледзячы на гэта доля палітычных партыяў як асноўных суб'ектаў выбарчых кампаній працягвае заставацца нязначнай. (Гл. табл. 2).

***Правядзенне пасяджэнняў органаў, якія ўтвараюць выбарчыя камісіі.*** Паводле паведамлення назіральнікаў, пасяджэнні органаў, якія ўтвараюць камісіі, у многіх выпадках праходзілі непразрыста і недэмакратычна, а ў некаторых рэгіёнах і таемна. Напрыклад, на пасяджэнне прэзідыума Аршанскага раённага Савета дэпутатаў і Аршанскага раённага выканаўчага камітэта па фарміраванні Аршанскай раённай выбарчай камісіі не былі запрошаныя прадстаўнікі, вылучаныя БСДП (Грамада) і Беларускай партыяй левых «Справядлівы свет». Пасяджэнне прэзідыума Барысаўскага раённага Савета дэпутатаў і Барысаўскага раённага выканаўчага камітэта прайшло без удзелу М. Статкевіч, вылучанай грамадзянамі ў Барысаўскую раённую выбарчую камісію. Ні праваабаронцу, ні грамадзян, якія яе вылучылі, на пасяджэнне камісіі не запрасілі і не паведамілі пра час яго правядзення. Аналагічныя факты адзначаны назіральнікамі ў Баранавічах, Наваполацку, Бабруйску і іншых гарадах. Адзначаны выпадкі нядопуску назіральнікаў на пасяджэнні органаў мясцовага кіравання і самакіравання па фарміраванні выбарчых камісій. Так, назіральніка Рэспубліканскага праваабарончага грамадскага аб'яднання «Беларускі Хельсінкскі камітэт» Р. Юргеля не пусцілі на сумеснае пасяджэнне прэзідыума Гарадзенскага абласнога Савета дэпутатаў і Гарадзенскага абласнога выканаўчага камітэта па стварэнню Гарадзенскай абласной выбарчай камісіі. Аналагічны выпадак адзначаны ў Салігорску.

Галасаванне па кандыдатах на ўключэнне ў камісіі праходзіла па спісу, рэальнага абмеркавання кандыдатур на пераважнай большасці пасяджэнняў

не адбывалася. Большасць пасяджэнняў праходзіла, як і ў мінулых выбарчых кампаніях, на працягу 15–20 хвілін.

Аналізуючы персанальны склад камісіяў у цэлым, варта адзначыць, што ў іх адбыліся толькі касметычныя змены. Паводле паведамлення назіральнікаў, камісіі сфарміраваны на 70–80% з асоб, якія раней з'яўляліся членамі камісій. Выбарчы кодэкс не змяшчае пераліку крытэрыяў, якім павінны адпавядаць члены камісій. На практыцы гэта прыводзіць да таго, што ў камісіі ўключаюцца асобы, якія маюць адпаведны вопыт работы. Па словах старшыні Цэнтральнай камісіі Л. Ярмошынай, у склад выбарчых камісій, як правіла, ўключаюць грамадзян з юрыдычнай адукацыяй або з вопытам арганізацыі і правядзення выбарчых кампаній.

***Абскарджанне рашэнняў аб фарміраванні камісій***. Назіральнікі паведамляюць аб адзінкавых выпадках абскарджання рашэнняў органаў, якія ўтвараюць камісіі, на неўключэнні ў склад камісіі. Усе пададзеныя скаргі пакінутыя без задавальнення. Так, рашэннем Гродзенскага абласнога суда ад 04.02.2010 г. адмоўлена ў задавальненьні скаргі Гродзенскай абласной арганізацыі партыі «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада» на рашэнне Прэзідыума Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў і Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта ад 28.01.2010 аб утварэнні Гродзенскай абласной выбарчай камісіі па выбарах дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў. Довады партыі аб тым, што на пасяджэнні кандыдатуры палітычных партый не абмяркоўваліся і галасаванне праходзіла па загадзя установленым спісе, судом не былі прынятыя пад увагу. У рашэнні суда адзначаецца: «больш за палову складу камісіі сфарміравана з прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, што адпавядае патрабаванням ч. 2 арт. 34 ВК, згодна з якой названыя прадстаўнікі павінны складаць не менш адной траціны складу камісіі ». Аналагічная матывацыя прыведзена ў рашэнні Мінскага гарадскога суда па скаргах партыі БНФ і ГА “БНФ-Адраджэнне”. Неадпаведнасць дакументаў, пададзеных уключанымі членамі камісій, патрабаванням Інструкцыі па справаводстве расцэнена судом як «нязначныя апіскі».

Адсутнасць у ВК крытэраў для фарміравання камісій дазволіла звесці судовы разгляд скаргаў толькі да фармальнай праверцы працэдуры стварэння камісій. Па сутнасці, дыскрымінацыйны характар не ўключэння ў камісіі, у першую чаргу, апазыцыйных актывістаў судамі не даследаваўся і не ацэньваўся.

**Высновы:**

1. Нягледзячы на ўнясенне ў ВК змяненняў, згодна з якімі выбарчыя камісіі фарміруюцца, як правіла, з не менш адной трацiны прадстаўнікоў палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў, тым не менш, у складзе выбарчых камісій працягвае заставацца нязначнай доля палітычных партый, прадстаўніцтва ж апазіцыйных партый у выбарчых камісіях зведзена да мінімуму;
2. пасяджэння органаў, якія ўтвараюць камісіі, у многіх выпадках праходзілі непразрыста і недэмакратычна, а ў некаторых рэгіёнах і таемна;
3. як і ў папярэдніх выбарчых кампаніях галасавання па кандыдатам у склад камісій праходзіла па спісу, рэальнага абмеркавання кандыдатур на пераважнай большасці пасяджэнняў не адбывалася;
4. выбарчыя камісіі сфарміраваны на 70-80% з асоб, якія раней з'яўляліся членамі камісій;
5. адзначаны адзінкавыя выпадкі абскарджання рашэнняў органаў па фарміраванні выбарчых камісій. Усе пададзеныя скаргі пакінутыя судамі без задавальнення;
6. ў сілу адсутнасці ў ВК крытэраў фарміравання выбарчых камісій, разгляду скаргаў у судах праведзены фармальна.

**Табліца 1. Звесткі аб складзе тэрытарыяльных выбарчых камісій па Рэспубліцы Беларусь**

| Вылучана | | % | Уключана | % ад колькасці вылучаных | % ад колькасці сяброў камісіі |
|---|---|---|---|---|---|
| **Усіх:** | **13106** | **100** | **12016** | **91,7** | **100** |
| | | | | | |
| ад грамадзян шляхам падачы заяваў | 7216 | 55,1 | 6327 | 87,7 | 52,7 |
| ад працоўных калектываў | 1590 | 12,1 | 1518 | 95,5 | 12,6 |
| ад палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў | 4300 | 32,8 | 4171 | 97 | 34,7 |
| У тым ліку: | | | | | |
| **ад палітычных партый** | 149 | 1,1 | 105 | 70,5 | 0,9 |
| З іх: | | | | | |
| **ад апазіцыйных палітычных партый** | 58 | 0,4 | 15 | 25,9 | 0,12 |
| БПЛ «Справядлівы свет» | 21 | 0,2 | 9 | 42,9 | 0,07 |
| БСДП (Грамада) | 8 | 0,06 | 2 | 25 | 0,02 |
| АГП | 14 | 0,1 | 4 | 28,6 | 0,03 |
| БНФ | 6 | 0,05 | 0 | 0 | 0 |
| БСДГ | | | | | |
| **ад грамадскіх аб’яднанняў** | 4151 | 31,7 | 4066 | 98 | 33,8 |

**Табліца 2. Звесткі аб складзе акруговых выбарчых камісій па Рэспубліцы Беларусь**

| Вылучана | | % ад колькасці вылучаных | Уключана | % ад колькасці вылучаных | % ад колькасці сяброў камісіі |
|---|---|---|---|---|---|
| **Усіх:** | **5499** | **100** | **4542** | **82,6** | **100** |
| З іх: | | | | | |
| ад грамадзян шляхам падачы заяваў | 1888 | 34,3 | 1457 | 77,1 | 32,1 |
| ад працоўных калектываў | 910 | 16,5 | 828 | 91 | 18,2 |
| ад палітычных партый і грамадскіх аб'яднанняў | 2701 | 49,1 | 2257 | 83,6 | 49,7 |
| У тым ліку: | | | | | |
| **ад палітычных партый** | 468 | 8,5 | 302 | 64,5 | 6,6 |
| З іх: | | | | | |
| **ад апазіцыйных палітычных партый** | 180 | 2,9 | 72 | 40 | 1,4 |
| БПЛ «Справядлівы свет» | 104 | 1,9 | 48 | 46,1 | 1,1 |
| БСДП (Грамада) | 10 | 0,2 | 3 | 30 | 0,07 |
| АГП | 43 | 0,8 | 14 | 32,6 | 0,3 |
| БНФ | 22 | 0,04 | 6 | 27,3 | 0,1 |
| БСДГ | 1 | 0,02 | 1 | 100 | 0,02 |
| **ад грамадскіх аб’яднанняў** | 2233 | 40,6 | 1955 | 87,6 | 43 |